УДК 882.6.+82.01.+82.

# КАТЭГОРЫЯ ЭСТЭТЫЧНАГА Ў ІДЭЙНЫМ КАНТЭКСЦЕ ПРАЗАІЧНЫХ МІНІЯЦЮР БАРЫСА САЧАНКІ

**Р.К. Казлоўскі**
УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

В статье раскрывается сущностная специфика идейно-философского содержания произведений малых прозаических жанров Бориса Саченко согласно эстетической концепции художественного отражения действительности. Подчеркивается, что эстетические со- и противопоставления в соединении со свободным философским рассуждением способствуют наиболее полному выявлению творческого замысла писателя.

The article discloses the peculiarities of the conceptual and philosophical content in Barys Sachanka's works of the small prose genre according to the aesthetic concept of artistic reflection of reality. It considers the main stylistic peculiarities of the minuatures, their figurativeness. It is stressed that aestetic comparison and contraposition alongside with free philosophic reasoning help to reveal fully the writer's creative intention.

Як здольны пісьменнік Барыс Сачанка ў беларускай літаратуры сцвердзіў сябе яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Неардынарная асоба, у творах − свой, адрозны ад іншых, погляд на рэчаіснасць. У мастацкай творчасці ў пісьменніка ўдала атрымліваліся малыя празаічныя формы – мініяцюры, невялікія апавяданні. Гэта, можа быць, у чымсьці звязана і з тым, што ў малых формах лягчэй «выліць» хуткаплыннае перажыванне ад успаміну, перадаць асобнае ўражанне, падаць пейзажную замалёўку, пранізаную лірычным пачуццём. Дзяцінства пісьменніка прыпала на ваенныя гады: было спаленне карнікамі роднай вёскі, высяленне з родных мясцін на прымусовую працу ў Нямеччыну. Жахі вайны пакінулі глыбокі след у душы, стварылі падмурак для фармавання гуманістычнага светапогляду. І вынікам роздуму, назіранняў стала проза пісьменніка. Мініяцюра ў ёй выступае як эстэтычнае фармальна-зместавае адзінства.

Катэгорыя эстэтычнага, як і эстэтычная змястоўная сутнасць, праяўляецца ў першую чаргу ў каштоўнаснай арыентацыі персанажаў і найбольш у асобе лірычнага героя (апавядальніка), калі такая існуе ў творы. Нярэдка пісьменнік, паказваючы антыідэал ва ўсёй шматаблічнасці праяваў адмоўнага, у апазіцыю да яго ставіць вобраз станоўчага героя, часта пададзенага толькі некалькімі штрыхамі-дэталямі, разлічваючы на асацыятыўнае ўяўленне чытача, які і павінен дамаляваць патрэбныя абрысы-якасці, адшурхоўваючыся ад супрацьлеглых у адмоўнага героя. У пэўных выпадках аўтар наўпрост



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адмаўляе заганныя грамадскія з’явы, рысы характараў, антычалавечую мараль. Творы Б.Сачанкі вызначаюцца той асаблівасцю, што ў іх даволі моцна адчуваецца асоба аўтара, яго перажыванні, грамадзянская пазіцыя. Магчыма таму ў творах дастаткова многа трагічнага, вялікае месца займаюць падзеі часоў вайны, сведкам якіх быў аўтар, нярэдка з амаль такім жа моцным хваляваннем ён перажывае і за сучасніка, яго клопаты і праблемы.

У сваіх творах Барыс Сачанка, мала сказаць, даследуе вайну, якая сваімі звышцяжкімі абставінамі вымушае чалавека дзейнічаць «з душы», без «падману», у адпаведнасці з уласным светапоглядам, пісьменнік яшчэ раз даследуе дзесьці самога сябе, праз сваю свядомасць прапускае падзеі мінуўшчыны. Не дарма яго «пісьмо» даследчыкі называюць суб’ектыўным, хаця адразу ж трэба заўважыць, што пры гэтым аўтар не губляе аб’ектыўнасці ў перадачы фактаў рэальнага жыцця. І менавіта ў мініяцюрах (у іх шырокім разуменні) найбольш выяўляецца асоба пісьменніка і тое трагічнае (як эстэтычная дамінанта), што ў выглядзе цяжкіх малюнкаў-абразкоў «мільгаціць» перад вачыма чытача, раскрываючы шырокую панараму жыцця, прапушчанага праз свядомасць аўтара. Ю.Бораў у кнізе «Эстэтыка» паказвае, што трагічнае, як эстэтычная катэгорыя, «раскрывае, па-першае, пагібель ці цяжкія пакуты індывідуальнасці; па-другое, неаднаўляльнасць для людзей яе страты; па-трэцяе, бессмяротныя грамадска цэлыя пачаткі, закладзеныя ў гэтай непаўторнай індывідуальнасці, і яе працяг у жыцці чалавецтва і, па-чацвёртае, грамадскі сэнс жыцця чалавека» [1, с.75]. Катэгорыя трагічнага ў творчасці пісьменніка адлюстроўвае ўсе вышэй прыведзеныя пункты.

Мініяцюрам характэрны некалькі скразных вобразаў, якія праходзяць праз усю Сачанкаву творчасць: лірычны герой-пакутнік, вораг-захопнік, партызан(салдат)-вызваляльнік і іншыя. Але вобразы гэтыя раскрываюцца не толькі ў пэўнай «сітуацыі», гэтаму дапамагае і аўтарскае разважанне, якое нярэдка ў канцы твора гучыць як мараль. Кампазіцыйная будова некаторых мініяцюр уяўляе сабою структуру з двух кампанентаў: сітуацыі (апісання) і разважання аўтара (лірычнага героя). Так, у псіхалагічнай мініяцюры «Фашыст» (1964) аўтар падзяляе твор на дзве часткі: у першай падае вобраз нямецкага салдата, які піша сваёй маці кожны тыдзень лісты, гаворыць пра сваю любоў да яе. У другой частцы Б.Сачанка быццам «станоўчы» вобраз салдата дапаўняе зусім іншай інфармацыяй, пасля чаго той набывае пачварныя рысы: «Расстрэльваючы кожны дзень жанчын у партазанскім краі, ...ён ні разу нават не падумаў, што гэтыя жанчыны — таксама маці...»[5,

с.35]. Яшчэ ў першай частцы аўтар у двукоссі прыводзіць словы з яго ліста «швайнэ русішэ» і «лібэ муці», якія гучаць эстэтычнымі антаганізмамі, падкрэсліваючы жорсткасць натуры з паказною дабрынёю і прыстойнасцю. Абодва «выразы» з лістоў стаяць на розных эстэтычных узроўнях, адпаведна нізкім і высокім, і ў выніку збліжэння высокае становіцца нізкім, яшчэ больш узмацняючы цынізм нямецкага салдата, увабраўшага фашысцкую ідэалогію.

Кампазіцыйную будову з двух кампанентаў маюць і іншыя малыя празаічныя творы Б.Сачанкі. Толькі кампаненты могуць уяўляць сабою яшчэ і розныя «пласты» катэгорыі часу, напрыклад: да вайны і пасля вайны (псіхалагічная мініяцюра «Нарцысы» (1970)). Як вынік утвараюцца часавыя эстэтычныя супастаўленні грамадскіх каштоўнасцяў.

Адным з крытэрыяў вызначэння трагічнага ў Б.Сачанкі з’яўляецца немагчымасць героя паўплываць на абставіны, якія нясуць яму непамерныя страты, альбо немагчымасць асобы змяніць рэчаіснасць, паўплываць на падзеі, якія ўжо адбыліся па ўласнаму недагляду. Так, у абразку «Мінутная слабасць» (1962) герой, узброены партызан, бачыць з дрэва ў лесе (гэта яго пост), як фашысты знішчаюць яго родную вёску з сям’ёю. Адчуванне бездапаможнасці, моцны стрэс, крайні душэўны пратэст прыводзяць да страты прытомнасці. У абразку «Качалка» (1962) у героя гіне дачушка. Трагізм сітуацыі заключаецца ў недальнабачнасці бацькі, які з лесу прынёс нейкі боепрыпас, ад якога пасля загінула яго ж дзіця. Памылка бацькі выступае як нейкае злачынства, і пакараннем за яго становіцца самазабойства. Узвышанае (пасляваеннае сямейнае шчасце) і жахлівае (бессэнсоўная смерць) эстэтычна збліжаюцца і ўзмацняюць трагізм сітуацыі.

Даследчык П.Навуменка сцвярджае, што старэйшаму пакаленню пісьменнікаў пашчасціла, што вайна, удзельнікамі якой яны былі, давала ім гатовыя сюжэты. У іншых (Б.Сачанкі, М.Стральцова) яна прыпала на дзяцінства. Вочы дзіцяці ўспрымаюць усё эмацыянальна, без глыбокага аналізу, і адсюль спробы «стварыць перш за ўсё не сюжэты, а эмацыянальны малюнак» [2, с.4]. Так можна патлумачыць узмоцнены трагізм (эстэтычную дамінанту) і неабходнасць скарыстання малых празаічных жанраў (напрыклад, мініяцюры як эстэтычнага фармальна-зместавага адзінства) для выяўлення эмацыянальна-афарбаваных рэалістычных малюнкаў рэчаіснасці. Творы ў спалучэнні ў нізкі, цыклы могуць утвараць падабенства кінастужкі ўражанняў, дзе кожны кадр − асобны маленькі твор.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Суб’ектывізм прозы Б.Сачанкі праяўляецца не толькі ў «я» лірычнага героя і біяграфізме ў творах, але і асаблівасцях творчай манеры пісьма. Так, стылю празаічных мініяцюр характэрна ў рознай ступені экспрэсіўнасць, у тэксце няцяжка адчуць эмацыянальны настрой аўтара, эстэтычную афарбоўку вобразаў. Многія даследчыкі (І. Навуменка, Ул. Юрэвіч і інш.) заўважалі ўменне Б.Сачанкі карыстацца прыёмамі ўнутранага маналогу, дыялогу, максімальна скарыстоўваць у творах магчымасці няўласна-простай мовы і па-майстэрску ўплесці гэта без парушэння эстэтычнай цэльнасці ў тканіну апавядання альбо твора нейкай іншай малой празаічнай формы. Нярэдка творы гучаць спавядальна, асабліва тыя, у якіх элемент аўтабіяграфізму найбольш вялікі, бо чалавеку (лірычнаму герою), лёс якога не песціў, вельмі ўласцівы трагізм мыслення, характэрна частае паўтарэнне ў свядомасці найбольш яркіх сцэн з жыцця, выпадкаў, якія паўплывалі на светапогляд, прымусілі паглядзець на рэчаіснасць іншымі вачыма, змяніць сістэму каштоўнасцяў, разуменне прыгожага і пачварнага, узвышанага і трагічнага. А гэта шчыльна спалучаецца з такою якасцю, прозы як аналітызм, і, у першую чаргу, аналізуецца асоба чалавека, псіхалогія яго паводзін, матывацыя тых ці іншых учынкаў альбо нават эмоцый. У мініяцюрах разглядаецца, як правіла, нейкі адзін дробны, хаця і не вельмі звычайны, не будзённы, выпадак, падзея, у якой героем рухаюць не толькі сілы вонкавага ўздзеяння, абставін, але і ўнутраная матывацыя, светапогляд. Вялікую ролю ў дамалёўцы мастацкіх вобразаў адыгрывае інтанацыя, якая надае не толькі эмацыянальную афарбоўку дзеянню, але і вызначае аўтарскую пазіцыю (у тым ліку і стаўленне да сваіх герояў) праз эстэтызацыю ці антыэстэтызацыю вобраза-персанажа, грамадскай з’явы.

У цыкле «Агарод» (1965) пісьменнікам робіцца спроба падаць нізку алегарычных мініяцюр і праз вобраз «агарода» паказаць людзей і праяўленне іх характараў у грамадстве. Але аўтарская спроба стварэння ўласных алегорый не заўсёды была ўдалай, бо нярэдка вобразы не маюць сталай іншасказальнасці ў народнай мове, падтэксту. Алегорыі Б.Сачанкі ў пэўных выпадках больш знешнія, ад чаго губляецца адчуванне праўдзівасці вобразу, страчваецца частка яго значэння, а эстэтычная катэгорыя камічнага губляе грамадска значнае абагульненне. «У гэтым цыкле ёсць сапраўдныя перлы, − зазначае Ул.Юрэвіч. − Але ж большасць з іх ніякага дачынення да алегорый не мае... Яны ўспрымаюцца як шаржы, напісаныя рукой мастака» [8, с.291-292].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У цыкле «Зялёнае дрэва» (зб. «Ваўчыца з Чортавай Ямы» (1978)) мініяцюра займае пануючае становішча. Вялікую ўвагу ў творах аўтар надае роднай старонцы, хатцы, полю, лесу, паказвае іх незвычайнае прыцягненне. Малая радзіма ставіцца Б.Сачанкам на самы высокі эстэтычны ўзровень (мініяцюры «Дома», «Наша радасць і шчасце», «Незабыўнае»), менавіта праз яе вымяраецца прыгажосць чужаземных краявідаў, душэўныя якасці лірычнага героя, які не быў «перакаці-полем». «Не думаў тады я, не гадаў нават, што ўсяго праз некалькі гадоў, аб'ездзіўшы многія чужыя краі, пабачыўшы і моры, і горы, душа мая будзе рвацца зноў сюды, на гэтыя лугавыя і палявыя сцежачкі, дарожкі, у знаёмы мне змалку лес, у сваю такую ціхую, маленькую вёсачку» [4, с.238].

Героі празаічных мініяцюр Б.Сачанкі нясуць пэўную філасофскую нагрузку і ўмоўна і ўтвараюць два полюсы: станоўчы (лірычны герой, дадатныя персанажы) і адмоўны (антыгерой). Прадстаўнікі першага ідуць побач з такімі эстэтычнымі катэгорыямі, як прыгожае, узвышанае, гераічнае, дзесьці смешнае, другога − трагічнае, пачварнае, камічнае. Мастацкая спецыфіка празаічнай мініяцюры дазваляе пісьменніку падаць думкі наўпрост, збліжаць эстэтычнае і антыэстэтычнае, ствараючы ў малым аб'ёме рэзкі кантраст эстэтычных узроўняў, дае магчымасць праз асобу лірычнага героя падаць меркаванне непасрэдна, зрабіць чытача аднадумцам, прымусіць паразважаць над фактам. Сцвярджэнне сістэмы агульначалавечых каштоўнасцей − зместавая дамінанта катэгорыі эстэтычнага ў мініяцюрах.

Асобна стаіць у кнізе «Родны кут» (1989) цыкл «Думкі ўроссып», які складаецца з філасофскіх мініяцюр, прысвечаных пісьменніцкай праблематыцы. Гэта роздум пра асаблівасці творчай працы, творчасці ўвогуле, натхненне і крызіс, роздум над лістамі і выказваннямі вядомых пісьменнікаў і інш. «Трагедыя таленту не ў тым, што яго надзяляюць «міленькай утульнай славай» (Акутагава), а хутчэй за ўсё, што ён пачынае верыць гэтай славе, жыць ёю, а то і купацца, як сыр у масле, у яе залацістых, але падманлівых, здрадлівых промнях» [6, с.374-375], − сцвярджае Б.Сачанка. Творы вызначаюцца высокай ступенню суб'ектыўнасці, сгушчанасцю і разважлівым ходам думкі, малым аб'ёмам (у некалькі радкоў).

Публіцыстычным пафасам і трагічна завостраным ідэйна-эстэтычным зместам вызначаецца цыкл «Запіскі аб радыяцыі» (зборнік «Трэцяе вока» (1992)) − хроніка падзей, якія адбыліся пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Кожная «запіска» − асобны маленькі празаічны



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

твор філасофскага зместу, нярэдка з трох-шасці радкоў. Трагічнае тут набывае абрысы агульна-нацыянальнай катастрофы. Максімальна сціскаючы слоўны матэрыял, Б.Сачанка даў творы ёмістыя ў сэнсавым плане, у малым паказаў вялікае, праз бяду асобнага чалавека – нацыянальную трагедыю. Напрыклад, «запіска», у якой аўтар падае ўсяго адзін «маленькі» факт пра падзеі 1986 года: «Сустрэўся з тымі, хто пабываў на Першамайскія святы і ў Хойніках, і ў Вялікім Боры. Усё там спакойна, ніякай трывогі. Сеюць, загараюць, п'юць малако, ядуць першую зеляніну − шчаўе, крапіву, цыбулю, часнок...»[7, с.172]. Творы набываюць публіцыстычны выкрывальны пафас. Аўтар у якасці фактычнага матэрыялу цытуе газеты, а пададзеныя дыялогі з людзьмі з забруджаных тэрыторый узмацняюць эфект трагічнасці. Сярод «запісак» можна вылучыць філасофскія роздумы над трагедыяй, абразкі жахаў, звязаныя найперш канкрэтнымі фактамі. Тут можна сустрэць мініяцюры ў форме публіцыстычнага паведамлення, сацыяльна-бытавой замалёўкі, можна ўбачыць анекдатычны абразок, у якім запісаны «чорны гумар» з «зоны». У цыкле «Напісана пяром» (зборнік «Трэцяе вока») у многіх мініяцюрах кранаюцца падзеі складанай гісторыі Беларусі, і за трагічным сцвярджаецца ўзвышанае: «Цярністыя шляхі беларускага слова… І не толькі слова, а і ўсяго, што звязана з Беларуссю, яе мінулым…» [7, с.393] Скарыстоўваючы разумовыя катэгорыі Святога Пісання (евангельскі цярністы шлях да раю), у асацыятыўным ідэйна-філасофскім змесце Радзіму Беларусь мастак ставіць на высокі эстэтычны ўзровень. Нярэдка ў мініяцюрах жахлівае і трагічнае (у грамадскай іпастасі) крочаць побач. «Сваіх нядобразычліўцаў і непрыяцеляў беларусы павінны ведаць. Адзін з іх − Р.Ялбжыкоўскі. Стаўшы архібіскупам Віленскай дыяцэзіі, ён забараніў ужываць беларускую мову ў касцёлах на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, а ксяндзоў, якія праводзілі па-беларуску службу, выселіў у небеларускія парафіі. З яго дапамогай былі выгнаны з Друі браты-марыяне, якія карысталіся ў сваім жыцці і служэнні Богу родным словам» [7, с.396].

У Барыса Сачанкі былі зборнікі гумарыстычных твораў «Вол-фігурыст» (1966) і «Халасцяк» (1969). Па жанравых асаблівасцях у іх, як зазначае Л. Савік, «можна заўважыць іранічную мініяцюру, казку, байку ў прозе, гумарэску, жарт, эпіграму» [3, с.23]. Камічнае і смешнае становяцца эстэтычнай дамінантай у ідэйным змесце.

Відавочнае праяўленне эстэтычных ацэнак у ідэйна-філасофскім змесце малых празаічных твораў з'яўляецца адной з адрозных рысаў мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ў празаічных мініяцюрах



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пісьменніка. Мастак працягнуў традыцыю празаічнай мініяцюры, зрабіў яе больш разнастайнай па тэматыцы, героях, падаў свой адрозны падыход да жыцця, сваю мерку чалавечых каштоўнасцей.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Борев Ю.Б. Эстетика / Ю.Борев. — М.: Политиздат, 1969. — 350 с.
2. Навуменка П. Пошукі ўласнай сцяжыны: Штрыхі да творчасці Барыса Сачанкі / П.Навуменка // Роднае слова. — 1996. — № 5. — С. 3 — 15.
3. Савік Л.С. Пад мірным небам бацькаўшчыны: Нарыс творчасці Барыса Сачанкі / Л.Савік. — Мінск: Навука і тэхніка, 1986. — 120 с.
4. Сачанка Б.Ваўчыца з Чортавай Ямы: Аповесці, апавяданні / Б.Сачанка. — Мінск: Маст. літ., 1978. — 240 с.
5. Сачанка Б. Дарогі: Выбранае / Б.Сачанка. — Мінск: Беларусь, 1971. — 432 с.
6. Сачанка Б. Родны кут: Аповесці, апавяданні, нарыс, эсэ / Б.Сачанка. — Мінск: Маст. літ., 1989. — 381 с.
7. Сачанка Б. Трэцяе вока: Аповесці, апавяданні, эсэ / Б.Сачанка. — Мінск: Маст. літ., 1992. — 479 с.
8. Юрэвіч У. Абрысы. Выбраныя літаратурна-крытычныя артыкулы / У.Юрэвіч. — Мінск: Маст. літ., 1976. — 434 с.


УДК 811.161.3+811.111

# ПАРАЎНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БІЯЛАГІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОЎ)

**І.К. Клачко**

УО «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Данная статья посвящена сравнительной характеристике заимствованных биологических терминов. Выделяются предметно-тематические группы данных терминов.

Given article is devoted to the comparative characteristic of borrowed biological terms. Substantially-subject group of given terms are distinguished.

У апошнія дзесяцігоддзі рэзка ўзрасла цікавасць лінгвістаў і адмыслоўцаў розных галін навукі і тэхнікі да праблем прыватна-галіновых тэрмінасістэм, што тлумачыцца ўзрастаючым патокам навуковай і тэхнічнай інфармацыі, працэсамі інтэграцыі, стыкоўкі навук, узмацненнем працэсаў тэрмінатворчасці.

Па гэтай прычыне ў мовазнаўстве ў апошні час паўстала пытанне ўсебаковага вывучэння спецыяльных галіновых тэрміналагічных сістэм, у тым ліку і білагічнай тэрміналогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ